# Партыйнае кіраўніцтва соцспаборніцтвам на прамысловых прадпрыемствах

Н. АУХІМОВІЧ

У пасляваенным пяцігадовым плане перад працоўнымі Совецкага Саюза пастаўлена адказная задача — дабіцца ў найкарацейцы тэрмін аднаўлення і далейшага развіцця ўсіх галін народнай гаспадаркі краіны. Гэта вялікая мэта ўзняла совецкі народ на новыя працоўныя подзвігі ва славу сваёй Радзімы, парадзіла нябачанае дагэтуль па сваіх размерах социялістычнае спаборніцтва, якое па мудраму вызначэнню таварыша Сталіна **«ператварае працу з зазорнага і цяжкага ярма, якім яна лічылася раней, у справу чэсці, у справу славы, у справу доблесці і геройства».**

Соцыялістычнае спаборніцтва, уцягваючы ўсё новыя і новыя масы, дапамагло дабіцца рашаючых перамог на фронце працы ў гады мірнага будаўніцтва і ў ваенны час. Пад яго сцягам совецкі народ змагаецца за выкананне грандыёзнага плана новай сталінскай пяцігодкі.

Большэвіцкая партыя, кіруючы соцыялістычным спаборніцтвам мас, узнімае і арганізоўвае працоўных на выкананне гаспадарча-палітычных задач. Поспех соцыялістычнага спаборніцтва залежыць ад узроўню свядомасці працоўных, глыбокага разумення імі агульнанародных інтарэсаў. Партыйныя арганізацыі, ведучы вялікую палітычную работу, выхоўваюць масы ў духу совецкага патрыятызма, растлумачваюць велізарнае гістарычнае і дзяржаўнае значэнне задач, якія стаяць перад краінай.

Пасля перамогі над гітлераўскай Германіяй і японскім імперыялізмам наша краіна зноў узялася за спыненае вайной мірнае соцыялістычнае будаўніцтва, за выкананне і перавыкананне плана новай сталінскай пяцігодкі.

Прайшоўшыя гады тытанічнай барацьбы совецкага народа пад мудрым кіраўніцтвам партыі большэвікоў увянчаліся велізарнымі поспехамі. З кожным днём растуць заводы, фабрыкі, шахты, руднікі, электрастанцыі, з года ў год павышаецца ўраджайнасць калгасных палёў, пабудаваны і будуюцца тысячы новых школ, больніц і іншых соцыяльна-культурных устаноў.

Беларуская ССР у сузор'і брацкіх рэспублік вялікага Совецкага Саюза ўкладвае сваю лепту ў агульную справу ўздыму і далейшага росквіту народнай гаспадаркі краіны.

Да Вялікай Айчыннай вайны прамысловасць Гомельскай вобласці займала адно з першых месц у рэспубліцы. За тры сталінскія пяцігодкі ў вобласці былі створаны зусім новыя галіны прамысловасці, пабудаваны буйныя заводы, як «Гомсельмаш», шклозавод імені Сталіна і рад іншых. У 1940 годзе валавая прадукцыя ўсёй прамысловасці перавысіла ўзровень 1913 года ў 30 з лішнім разоў.

У выніку вайны і акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі прамысловасць, як і ўся народная гаспадарка Гомельскай вобласці, была разбурана.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

У сучасны-ж момант на месцы развалін і руін у 4 з лішнім гады, пры штодзённай дапамозе Цэнтральнага Камітэта Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў) і совецкага ўрада, працоўныя нашай вобласці аднавілі і ўвялі ў дзеянне амаль усе прадпрыемствы, разбураныя нямецка-фашысцкімі варварамі, а таксама пабудавалі новыя: домабудаўнічы камбінат у Рэчыцы, завод «Штамп», тэкстыльную фабрыку ў Гомелі і інш.

Ажыццяўляючы задачы, намечаныя пяцігадовым планам, рад прадпрыемстваў вобласці па выпуску прамысловай прадукцыі перавысіў ужо даваенны ўзровень. Так, рамонтна-падшыпнікавы завод пераcрыў даваенны ўзровень у 4 разы, электратэхнічны ў 2 разы, фанерна-запалкавы камбінат выпускае прадукцыі прыкладна столькі, колькі выпускаў напярэдадні вайны. Прадпрыемствы паліўнай прамысловасці ў гэтым годзе дадуць прадукцыі больш, чым запланавана на 1950 год.

На многіх прадпрыемствах пабудаваны новыя цэхі, павялічаны вытворчыя магутнасці, уведзены ў эксплаатацыю новыя агрэгаты і дадатковае абсталяванне.

Шырока разгарнуўшаеся соцыялістычнае спаборніцтва за датэрміновае выкананне пяцігадовага плана і дастойную сустрэчу 30-годдзя БССР забяспечыла паспяховае вырашэнне задач па выкананню планаў на радзе прадпрыемстваў.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы